З надыходзячым 1995 годам!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 20 (882) | ЧАЦВЕР, 29 снежня 1994 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная



**КАЛІ ЛАСКА, НА НАВАГОДНЮЮ ЁЛКУ!**

2-га студзеня ў вучэбным корпусе №1 для дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта праводзіцца навагодняя ёлка з удзелам Дзеда Мароза і Снягуркі.

Пачатак з 12 гадзін.

**ПРАФКОМ.**

## ДАРАГІЯ СЯБРЫ !

Мы -- на парозе Новага 1995 года. Якім ён будзе для нас, што новага, канструктыўнага ўнясе ў наша жыццё? Не сакрэт, што людзі ўжо стаміліся ад няўпэўненасці ў заўтрашнім дні, ад цяжкасцей, з якімі штодзённа сустракаюцца і на рабоце, і дома. Усё гэта ад эканамічнай і палітычнай нестабільнасці ў краіне. Але жыццё павінна працягвацца, а чалавека, як бы там ні было, надзея на перамены да лепшага не пакідае. Таму будзем спадзявацца, што надыдуць больш радасныя для нашага грамадства дні. Пасіўнае іх чаканне жаданых вынікаў можа і не прынесці. Неабходна кожнаму з нас вызначыць сваю пазіцыю, тым больш, што вясной 1995 г. будуць праводзіцца выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.

Надыходзячы год будзе мець і такую памятную і святую дату, як 50-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Дастойна ўшанаваць яе ветэранаў, усіх, чый лёс абпаліла вайна, -- наш з вамі абавязак.

Жадаем усім здароўя, шчасця, поспехаў у працы і вучобе ў Новым 1995 годзе!

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**

## ПАДАРУНКІ -- ДЗЕЦЯМ

Любімае свята ўсіх дзяцей -- Новы год. Яго яны чакаюць як сапраўднага цуда, з падарункамі ад Дзеда Мароза і Снягуркі. Па добрай традыцыі не першы год у нашым універсітэце праводзіцца дабрачынная ёлка "Ад сэрца да сэрца". Студэнты ГДУ, будучыя педагогі, якія праходзяць спецыялізацыю "Арганізацыя і методыка пазакласнай і пазашкольнай работы" і вывучаюць этыку і эстэтыку, а таксама школьнікі горада рыхтуюць падарункі для хлопчыкаў і дзяўчынак, абдзеленых лёсам -- сірот і інвалідаў. Гэта ўклад студэнцкай і вучнёўскай моладзі ў высакародную справу -- акцыю Беларускага дзіцячага фонду "Нашы сэрцы -- хворым дзецям".

Самыя разнастайныя прыгожыя, рознакаляровыя цацкі, зробленыя рукамі студэнтаў і вучняў СШ №№ 16 і 44, былі прынесены Дзеду Марозу са Снягуркай, якія прымалі каля зялёнай прыгажуні ёлкі шчодрыя дары (на здымку). Захаплялі сваёй арыгінальнасцю, фантазіяй аўтарскія выстаўкі: навагодніх букетаў, кампазіцый, дэкаратыўных пано, сувеніраў, мяккіх цацак, вязаных сурвэтак, аб'яднаных пад назвай "Калядныя ўзоры", рэдкіх па тэхніцы выканання работ з бяросты, малюнкаў і многае-многае іншае. Іх выканалі Л.І.Жалезнякова, Т.З.Бараноўская, Н.Э.Васільчанка, В.І.Шыловіч, Т.В.Шыловіч, брат і сястра Кузняцовы.

Абласное таварыства "Кніга" прадставіла тут дзіцячую літаратуру.

Усё багацце сабраных на дабрачыннай ёлцы падарункаў трапіць у рукі дзяцей -- у бальніцы, дзіцячыя дамы, малазабяспечаныя сем'і.

**Т.Нікалаева.**

**Фота У.Чысціка.**



# ЗАВОЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ -- 20 ГАДОЎ

**З** моманту ўтварэння нашага універсітэта, якому сёлета споўнілася 25 гадоў, падрыхтоўка спецыялістаў па завочнай форме навучання ажыццяўлялася на завочных аддзяленнях факультэтаў. Прарэктарам па завочнаму навучанню тады была прызначана дацэнт Т.П.Трацэўская. Яна ж была і першым дэканам завочнага факультэта, які быў створаны ва універсітэце з 1974-75 навучальнага года. На пасаду прарэктара быў прызначаны к.б.н. А.І.Балтоўскі.

У першыя гады існавання завочнага факультэта, як самастойнай структуры ў складзе універсітэта, падрыхтоўка спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці вялася на 8 спецыяльнасцях: гісторыя, беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, матэматыка, біялогія, эканоміка працы, механізаваная апрацоўка эканамічнай інфармацыі і фізічная культура.

З 1978 года на працягу 10 гадоў завочны факультэт узначальвала дацэнт Г.В.Саннікава. Прарэктарамі па завочнаму навучанню ў апошнія гады працавалі выпускнік факультэта кандыдат педагагічных навук Л.Н.Сечка, які, дарэчы, цяпер працуе ў кантрольных органах прэзідэнцкай улады, і кандыдат філалагічных навук М.М.Воінаў. Мікалай Мікалавіч, з'яўляючыся прарэктарам па вучэбнай рабоце універсітэта, і цяпер шмат увагі ўдзяляе дзейнасці завочнага факультэта.

За гады існавання універсітэта па завочнай форме навучання падрыхтавана 11352 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. Дарэчы, у 1992 г. з ГДУ быў выпушчаны 10-тысячны спецыяліст, які атрымаў адукацыю без адрыву ад вытворчасці. За 20 гадоў свайго існавання факультэт падрыхтаваў 9266 спецыялістаў.

Цяпер на завочным факультэце навучаецца 2640 студэнтаў на 13 спецыяльнасцях. У апошнія гады на факультэце пачала ажыццяўляцца падрыхтоўка студэнтаў па новых спецыяльнасцях: геаграфія, эканоміка і кіраванне прадпрыемствам /фірмай/, правазнаўства, руская, беларуская мова і літаратура. Ужо зроблены два выпускі спецыялістаў па бухгалтарскаму ўліку. У гэтым навучальным годзе адбудзецца першы выпуск на спецыяльнасці "Геаграфія".

Вядома, што падрыхтоўка спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці разлічана, у першую чаргу, на тых, хто працуе ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю. Разам з тым трэба адзначыць, што цяпер, калі эканоміку Беларусі ахапіў глыбокі крызіс, калі скарачаецца неабходнасць у новых спецыялістах і павялічваецца колькасць беспрацоўных з ліку моладзі, усё больш сярод студэнтаў-завочнікаў з'яўляюцца асобы, якія працуюць не па профілю абранай у ВНУ спецыяльнасці або ўвогуле работы не маюць. Гэта, у сваю чаргу, адмоўна адбіваецца на паспяховасці і на атрыманні ведаў. Відавочна, што той, хто не працуе па спецыяльнасці на вытворчасці або ў школе, не заўсёды імкнецца атрымаць максімум ведаў. Для такой катэгорыі студэнтаў характэрны асабістая неарганізаванасць, недысцыплінаванасць, бессістэмнасць у вучобе. Зусім іншы малюнак наглядаецца ў тых студэнтаў, прафесіі якіх адпавядаюць спецыяльнасці. Традыцыйна высокія паказчыкі паспяховасці маюць студэнты спецыяльнасцей: біялогія, эканамічная інфарматыка і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання, бухгалтарскі ўлік, геаграфія, гісторыя.

Аб якасці падрыхтоўкі спецыялістаў сведчыць абарона дыпломных работ і праектаў, здача дзяржаўных экзаменаў. Значная колькасць дыпломных работ абараняецца выпускнікамі на "выдатна" і "добра". Вынікі навуковых даследаванняў, праведзеных выпускнікамі 1993 г. спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік і аналіз гаспадарчай дзейнасці" Т.В.Тумар і Г.У.Невяроўскай, укаранены ў вытворчасць. Г.У.Невяроўская працуе цяпер старшым выкладчыкам кафедры "Бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці" і вучыцца ў завочнай аспірантуры. Т.В.Тумар спалучае практычную дзейнасць бухгалтара з выкладаннем на факультэце цыклавой падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі ГДУ.

Нашы выхаванцы займаюць пасады ў розных галінах народнай гаспадаркі і эканомікі, адукацыі, культуры і інш. Выпускнікамі факультэта з'яўляюцца таксама намеснік галоўнага бухгалтара універсітэта А.У.Азяўчыкава, бухгалтар А.У.Баброўнік, А.Ц.Жураўлёў, які працуе начальнікам СПМК-148, У.А.Захарчанка -- начальнік тралейбуснага ўпраўлення г.Гомеля, Р.В.Шваб -- намеснік начальніка РАУС Цэнтральнага раёна, Н.Т.Хадзько -- настаўніца рускай мовы і літаратуры СШ № 26 г.Гомеля, Я.С.Чорны -- начальнік аддзела Гомельскага рэгіянальнага банка "Белзнешэканомбанк", А.А.Мацвееў -- начальнік аддзела страхавой кампаніі БелАСКО /Гомель/; майстры спорту і майстры спорту міжнароднага класа Мікалай Кіраў, Віктар Пусеў, Сяргей Смаль, Алена Палявая, Алена Маракуца; І.А.Бароўская -- выкладчыца кафедры беларускай мовы ГДУ.

Цесныя сувязі ўсталёўваюцца паміж завочным факультэтам і філалагічнымі кафедрамі універсітэта, з аднаго боку, і Рэчыцкім педагагічным каледжам -- з другога. У гэтым годзе пачала навучанне група з 20-ці чалавек на ІІІ курсе спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" -- выпускнікоў гэтай навучальнай установы. Такое супрацоўніцтва абнадзейвае факультэт і выкладчыкаў, якія працуюць на ім, бо, па меркаванню спецыялістаў, выпускнікі каледжа маюць даволі трывалыя веды па тых дысцыплінах, якія яны ўжо здавалі. Такую ж падрыхтоўку спецыялістаў можна было б весці, пачынаючы з ІІІ-га курса і на спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік", прыцягваючы на вучобу лепшых выпускнікоў тэхнікумаў. Аднак на прапановы факультэта па арганізацыі такой работы кафедра слаба рэагуе.

Узровень ведаў студэнтаў залежыць не толькі ад якасці работы выкладчыкаў на лекцыях, але і ад арганізацыі самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў, забяспечанасці іх неабходнай літаратурай. Яўна недастаткова яе па дысцыплінах спецыяльнасцей "Правазнаўства", "Гісторыя", нямецкай мове, эканамічнага прафілю і інш.

У навучальным працэсе на факультэце задзейнічаны больш за 300 выкладчыкаў, сярод якіх прафесары У.В.Анічэнка, І.Ф.Харламаў, М.В.Селькін, У.М.Калмыкоў, дацэнты У.І.Качаткоў, У.П.Бабына, Л.С.Лазучэнкава, Л.С.Баннікава, Р.Р.Лазько і многія іншыя.

Супрацоўнікі дэканата завочнага факультэта выказваюць шчырую ўдзячнасць рэктарату, усім службам універсітэта, якія аказваюць рэальную дапамогу ў забеспячэнні жыццядзейнасці факультэта, у арганізацыі вучэбнага працэсу.

**М.МУРАШКА,**
**дэкан завочнага факультэта,**
**дацэнт.**



**ГЭТА ЦІКАВА**

Ніхто, на нашу думку, не стане аспрэчваць той факт, што многія з нас яшчэ вельмі слаба ведаюць мінулае сваёй рэспублікі, роднага краю, тых мясцін, дзе мы жывем. Таму лічым карыснымі публікацыі на гістарычную тэматыку. Так, у папярэднім навучальным годзе мы змяшчалі гістарычныя звесткі пяцікурсніцы гісторыка-юрыдычнага факультэта Алены Бабовіч аб гомельскім парку.

Сёння ўвазе чытачоў прапануем артыкул асістэнта кафедры гісторыі Беларусі В.Сычова пра былы маёнтак Румянцавых.

# З ГІСТОРЫІ ГОМЕЛЬСКАГА МАЁНТКА РУМЯНЦАВЫХ

**Г**омельскі маёнтак быў падараваны Кацярынай II генерал-фельдмаршалу П.А.Румянцаву ў 1776 г. Пасля яго смерці маёнткам валодалі яго сыны Мікалай Пятровіч /1796-1826 г.г./ і Сяргей Пятровіч Румянцавы /1826-1834 г.г./. Апошні ў 1831 г. ва ўласнасць казны прадаў Гомель з прыгараднымі вёскамі /Якубоўкай і Спаскай слабодай/, а ў 1834 г. І.Ф.Паскевічу -- увесь астатні маёнтак.

Уладальнікі маёнтка П.А., М.П. і С.П.Румянцавы -- былі буйнымі дзяржаўнымі дзеячамі Расійскай імперыі, уваходзілі ў лік самых багатых расійскіх памешчыкаў.

Петр Аляксандравіч Румянцаў-Задунайскі /1725-1796 г.г./ — вядомы рускі палкаводзец, генерал-фельдмаршал, які вызначыўся ў перыяд Сямігадовай вайны, калі ён камандаваў паслядоўна брыгадай, дывізіяй і корпусам. Буйнейшай і важнейшай перамогай, атрыманай пад яго кіраўніцтвам, было ўзяцце моцнай крэпасці Кольберг /1761 г./. Актыўны ўдзел ён прымаў і ў руска-турэцкіх войнах канца XVIII ст. у якасці камандуючага арміямі. Тут ён праславіўся перамогамі ў бітвах пад Рабой Мошкай, пры Ларге і Кагуле. У 1770 г. яму быў прысвоены чын генерал-фельдмаршала і тытул графа з ганаровай назвай "Задунайскі". У руска-турэцкай вайне 1787-1791 г.г. ён узначальваў Украінскую армію і праславіўся ўзяццем Хоціна і Ачакава. П.А.Румянцаў з'яўляўся буйным ваенным тэарэтыкам, распрацаваў і абгрунтаваў тактыку сінхронных ваенных дзеянняў калонамі, карэ і рассыпным строем. Напісаны ім у 1770 г. "Абрад службы" быў прыняты ў якасці статута рускай арміі.

Буйным дзяржаўным дзеячом быў яго сын М.П.Румянцаў /1754-1826г.г./.

Дыпламат у 1781-95 г.г., член Дзяржаўнага Савета з 1801 г., міністр замежных спраў у 1808-1814 г.г., з 1809 г. -- канцлер, ён быў актыўным прыхільнікам збліжэння з Францыяй. Айчынная вайна, якая пачалася ў 1812 г., фактычна паклала канец яго кар"еры, і ў 1814 г. ён пайшоў у адстаўку. Вельмі вялікую вядомасць М.П.Румянцаў набыў як мецэнат, які заахвочваў і фінансаваў навуковыя экспедыцыі /І.Ф.Крузенштэрна і Ю.Ф.Лісянскага /1803-1806г.г./, Кацэбу /1815г./, збіранне і публікацыі гістарычных дакументаў /на яго сродкі працавалі многія гісторыкі і архівісты -- І.І.Грыгаровіч, І.Н.Лабойка, К.Ф.Калайдовіч, Я.І.Бярэднікаў, А.Х.Вастокаў і інш., якія пачалі выдаваць "Беларускі архіў старажытных грамат"/. Багатая бібліятэка М.П.Румянцава з'явілася асновай так званай Румянцаўскай бібліятэкі ў Маскве /пазней -- Дзяржаўная бібліятэка імя У.І.Леніна/. М.П.Румянцаў быў выбраны ганаровым членам шэрагу навуковых таварыстваў у Расіі і за мяжой, а ў 1819 г. — ганаровым членам Расійскай Акадэміі Навук.

С.П.Румянцаў /1755-1838 г.г./ таксама пачынаў сваю дзейнасць як дыпламат. Ён быў рускім пасланнікам у Берліне і Стакгольме, а ў 1796-97 г.г. — членам калегіі замежных спраў. У 1797-99 г.г. з'яўляўся дырэктарам дваранскага дапаможнага банка і міністрам удзелаў, у 1802-1833 г.г. -- член Дзяржаўнага савета. Ён прымаў удзел у распрацоўцы праектаў ліберальных рэформ пачатку XIX ст., з'явіўшыся ініцыятарам закона аб вольных хлебаробцах /1803 г./. С.П.Румянцаў у 1810 г. быў выбраны ганаровым, а ў 1828 г. -- правадзейным членам Расійскай Акадэміі Навук.

Такім чынам, Румянцавы — уладальнікі Гомельскага маёнтка — з поўнай падставай могуць быць аднесены да кола самага адукаванага рускага дваранства.

**М**аёнтак знаходзіўся на паўднёвым усходзе Беларусі, займаў звыш 213 тыс. дзесяцін і складаў амаль увесь Беліцкі павет Магілёўскай губерні. У населеных пунктах маёнтка /іх у розны час налічвалася ад 70 да 79/ жыло да 38 тыс. душ прыгонных сялян, г.зн. да 2,6% сялян памешчыкаў Беларусі.

Прыродныя ўмовы гэтага рэгіёна даволі спрыяльныя для развіцця сельскай гаспадаркі -- тут здаўна вырошчвалі адны з самых багатых у Беларусі ўраджаі зерневых культур. Шматлікасць заліўных лугоў садзейнічала развіццю жывёлагадоўлі. Актыўныя заняткі мясцовага насельніцтва ляснымі промысламі вызначаліся значнай лясістасцю тэрыторыі /у 1838 г. лясы займалі каля 43% земляў маёнтка/. Зручнасць геаграфічнага становішча -- наяўнасць водных і сухапутных гандлёвых шляхоў — стварала перадумовы для прыцягнення мясцовага насельніцтва ў гандлёвыя аперацыі і для распаўсюджвання возніцкага промыслу. Багацце высокаякаснага пяску, гліны, балотных руд садзейнічала захаванню і развіццю мясцовых традыцый рамёстваў /шклоплавільнага, ганчарнага, жалезаробчага, кавальскага/.

Асаблівасцю саслоўна-веравызнальнага складу сялянскага насельніцтва гэтага краю з'яўляўся даволі высокі працэнт стараобрадцаў — выхадцаў з Расіі. У 1817 г. насельніцтва стараверчых вёсак, выдзеленых у спецыяльнае ведамства маёнтка, складала 2025 рэвізійных душ /з 17416 рэвізійных душ усяго маёнтка, або звыш 12%/. У цэлым па маёнтку іх было яшчэ больш, так як значная колькасць старавераў жыла і ў вёсках, пераважна заселеных сялянамі праваслаўнага веравызнання. Юрыдычнае становішча старавераў адрознівалася ад становішча асноўнай масы сялянскага насельніцтва толькі ў сістэме эксплуатацыі — стараверы былі аброчнымі.

Форма эксплуатацыі большасці сялян Гомельскага маёнтка на працягу ўсяго разглядаемага перыяду была змешанай. Варта адзначыць, што сяляне маёнтка ў цэлым былі некалькі менш абцяжараны павіннасцямі, чым у сярэднім па Беларусі. Аднак па маёнтку паўсюдна практыкавалася ўрочная сістэма паншчыны і нормы ўрокаў былі даволі высокімі.

(ЗАКАНЧЭННЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ.)

# СПЕЦЫЯЛІСТЫ СЁННЯШНЯГА І ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ РЫХТУЮЦЦА НА КАФЕДРЫ АСАІ

*1-га студзеня спаўняецца 15 гадоў з дня адкрыцця ў нашым універсітэце кафедры "Тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі". Узрост яе, можна сказаць, мяжы сапраўднай сталасці яшчэ не дасягнуў, але ўсё ж ёсць падставы сцвярджаць, што яе калектывам зроблена нямала: за паўтара дзесяцігоддзя падрыхтавана шмат неабходных народнай гаспадарцы спецыялістаў -- інжынераў для работы з сучаснымі ЭВМ.*

Наш карэспандэнт гутарыць з загадчыкам кафедры, былым выпускніком эканамічнага факультэта к.т.н., дацэнтам А.М.Дземідзенкам.

*-- Алег Міхайлавіч, давайце крыху азірнемся ў мінулае і прыгадаем асноўныя этапы развіцця кафедры.*

-- Мэтай яе стварэння была арганізацыя ўсіх відаў заняткаў па матэматычнай і тэхнічнай падрыхтоўцы студэнтаў эканамічнага факультэта дзённай, вячэрняй і завочнай форм навучання. Заняткі вяліся са студэнтамі спецыяльнасцей "Арганізацыя машыннай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі" і "Эканоміка працы". Аснову выкладчыцкага саставу кафедры склалі дацэнты Г.К.Котаў, які першы выконваў абавязкі яе загадчыка, Н.В.Аўчыннікава, асістэнты М.І.Прахарэнка, В.І.Жулькоў, У.Р.Ракаў, Н.А.Анцюшына. З чэрвеня 1980 года загадчыкам кафедры быў выбраны дацэнт А.І.Іванюк, праз некалькі месяцаў да работы прыступіў дацэнт У.С.Давыдаў. У яе калектыве сталі працаваць выпускнікі эканомфака спецыяльнасці АМАЭІ: М.А.Шапавалава, В.А.Драбышэўскі, А.М.Паташэнка і я.

У 1986 годзе кафедра ў поўным саставе, акрамя дацэнтаў М.І.Багданава і У.Р.Ракава, была пераведзена на фізічны факультэт і атрымала новую назву "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" /АСАІ/. Асноўнай яе мэтай стала падрыхтоўка спецыялістаў фізічнага факультэта па спецыяльнасці "Фізічная электроніка" для прадпрыемстваў Міністэрства радыёэлектроннай прамысловасці, у прыватнасці -- прадпрыемстваў Гомельскай вобласці.

У верасні 1990 г. на кафедры адкрылася новая спецыяльнасць АСАІК /набор -- 25 чалавек/, акрамя таго ажыццяўлялася падрыхтоўка адной групы студэнтаў па спецыяльнасці "Фізічная электроніка", а таксама тэхнічная падрыхтоўка студэнтаў эканомфака.

*-- У сучасны момант вылічальная тэхніка знаходзіць усё больш шырокія сферы прымянення і, натуральна, патрэба ў кадрах для гэтага ўзрастае. Вы іх і рыхтуеце. Але ж на прадпрыемствах, у банках ужо ёсць адпаведныя спецыялісты, якім трэба толькі крыху падвучыцца новаму. Ці аказваеце вы ім у гэтым дапамогу, паколькі з'яўляецеся адной з трох кафедр у Рэспубліцы Беларусь, якая можа даваць веды ў гэтай галіне?*

-- Так, безумоўна. Яшчэ ў 1986 г. па ініцыятыве і з непасрэдным удзелам кафедры АСАІ арганізаваны факультэт перападрыхтоўкі кадраў і павышэння кваліфікацыі, першым дэканам якога быў былы загадчык кафедры АСАІ дацэнт А.І.Іванюк. Штогадовы набор слухачоў на ім складаў 200-250 чалавек. Праз год на базе нашай кафедры і кафедры тэарэтычнай фізікі быў створаны вучэбна-навукова-вытворчы цэнтр, які аб"ядноўвае ўсе віды работ па падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў ГДУ і прадпрыемстваў горада. Падрыхтавана і выпушчана група апаратаў ПЭВМ па спецыяльнасці "Прафесіянальнае прымяненне персанальных ЭВМ", пачата падрыхтоўка апаратараў ПЭВМ па індывідуальных заказах прадпрыемстваў і арганізацый.

*-- Жыццё на месцы не стаіць, уносіць свае карэктывы, і вучэбны працэс у вышэйшай школе -- не выключэнне. Якія ў сувязі з гэтым адбыліся змены на вашай кафедры?*

-- Цяпер навучанне студэнтаў вядзецца па дзённай форме навучання па спецыяльнасці "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі". Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю "Інжынер-сістэматэхнік". На парадку дня -- падрыхтоўка ўніверсальнага прафесіянальнага карыстальніка ПЭВМ як для буйных прадпрыемстваў, так і для невялікіх арганізацый і ўстаноў у вобласці і рэспубліцы. Пачата падрыхтоўка спецыялістаў шырокага профілю, якія ведаюць мовы праграміравання, аперацыйныя сістэмы і пакеты прыкладных праграм, маючыя навыкі вызначэння няспраўнасцей ЭВМ і правядзення рамонту, умеючых працаваць у сетках ЭВМ, г.зн. універсалаў, якія добра арыентуюцца ва ўсіх галінах работы сучасных ЭВМ. Нашы выпускнікі карыстаюцца вялікім попытам. Апошнія два гады ўсе яны атрымлівалі месцы размеркавання і працуюць у банках, дзяржаўных і камерцыйных арганізацыях, школах, ВНУ.

Дзевяць нашых выкладчыкаў працуюць над стварэннем праграмнага забеспячэння для работы бухгалтэрыі універсітэта ў складзе АСК ГДУ.



*-- Даць студэнту грунтоўныя веды па яго будучай спецыяльнасці, безумоўна, могуць выкладчыкі з высокім навуковым патэнцыялам, якія свае веды развіваюць, удасканальваюць...*

-- Так, і пацвярджэннем таму можа служыць удзел супрацоўнікаў нашай кафедры ў навукова-даследчай, вынаходніцкай рабоце. У 1983 г. за распрацоўку комплексу ўстройстваў па даследаванню характарыстык рэальных камунікацыйных сістэм дацэнты А.І.Іванюк і У.С.Давыдаў былі ўзнагароджаны адпаведна сярэбраным і бронзавым медалямі ВДНГ. З 1980 па 1991 гг. кафедрай выкананы шэраг навукова-даследчых і інжынерна-канструктарскіх работ з прадпрыемствамі і навуковымі інстытутамі краіны на гасдагаворных пачатках. Паспяхова завершаны сумесныя работы з навукова-даследчымі інстытутамі радыёфізікі, аўтаматызаваных сістэм кіравання г.Масквы, Рыгі і інш.

*-- А якія праблемы на сённяшні дзень найбольш хвалююць ваш калектыў?*

-- Каб рыхтаваць спецыялістаў заўтрашняга дня, неабходна мець самую сучасную тэхніку і пастаянна абнаўляць яе парк. Аднак, на жаль, яе нам і не хапае, нягледзячы на тое, што ва ўмацаванні нашай тэхнічнай базы вялікую дапамогу аказваюць рэктарат універсітэта, спонсары. Некаторыя прамысловыя прадпрыемствы і камерцыйныя структуры бясплатна перадалі для нашых патрэб камп"ютэры і камплектуючыя для іх. І ўсё ж гэтага недастаткова. Але хочацца з аптымізмам глядзець у будучае і спадзявацца на перамены да лепшага.

Гутарыла Т.НІКАЛАЕВА.

На здымку: калектыў кафедры АСАІ.

Фота І.Чысціка.





# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

## ПАРАДЫ ДЗЕДА МАРОЗА

Людзі з дрэннай памяццю павінны пазычаць грошы ў тых, у каго яна яшчэ больш горшая.

❄

Не абганяй таго, хто бяжыць наперадзе: а раптам ён бяжыць не ў той бок?

❄

Калі хочаце, каб жаночая аўдыторыя разам змоўкла, задайце пытанне: "Хто з вас самая старэйшая?"

## МІНІЯЦЮРЫ

Як лёгка развучыцца думаць, калі можна гаварыць усё!

❄

Некаторых задавальняе грукат эпохі: не чуваць ні голасу сумлення, ні крыку душы.

❄

Нават белыя плямы робяць гісторыю заплямленай.

### *Апошнія навіны*

## ПРОСТЫ САКРЭТ

Паперы ў краіне не хапае. І гэта не дзіўна -- вельмі шмат друкуюць грошай.

## ЦВЁРДАЕ СЛОВА

Група спецыялістаў з Мінфіна ўзяла крэдыт у Міжнародных банкаў, і, каб зарабіць валюту, адправілася ў Монтэ-Карла пагуляць у рулетку. Яны абяцалі без 100 мільярдаў не вяртацца і пакуль слова трымаюць -- не вяртаюцца.

## ШТО ТАКОЕ АКЦЫІ?

Многія лічаць, што акцыі -- гэта для нас штосьці новае. Не, таварышы. Акцыі -- гэта калі грошы даюць па талонах. А да талонаў нам не прывыкаць!




Усмешка мастака

## ЖЫЛЛЁМ БУДЗЕМ ЗАБЯСПЕЧАНЫ

Вучоныя падлічылі, што калі мы і надалей так будзем адносіцца да прыроды, дык да 2000 года нас застанецца столькі, што ў кожнага будзе асобная кватэра.

## ДЫЯЛОГІ З СЯМЕЙНАГА ЖЫЦЦЯ



"Дзе зарплата?"

Жонка: "Мой муж памёр праз пяць гадоў пасля жаніцьбы".

Доктар: "Дзякуй богу! Яму не давялося доўга мучыцца."

❄

Жонка: "Куды ты падзеў кнігу "Як пражыць 100 гадоў?"

Муж: "Я яе спаліў. Мне ўсё роўна столькі не працягнуць".

### *АНЕКДОТЫ*

Жонка адчытвае мужа:

-- І як ты толькі мог! Пайсці напярэдадні Новага года ў рэстаран і не вярнуцца! Я ўсю ноч не самкнула вачэй!..

-- Дарагая! Ты думаеш я самкнуў!?

❄

Паліцэйскі спыняе п'янага мужчыну.

-- Куды гэта вы ідзяце?

-- Як куды? З гасцей іду дадому. Новы год адзначылі -- вось цяпер іду дамоў.

-- Які Новы год?! Ужо сакавік!

-- Таму я і спяшаюся. Жонка, напэўна, хвалюецца!



У аснову ўсходняга гараскопа, якім мы карыстаемся, пакладзены 12-гадовы перыяд абарачэння Юпітэра вакол Сонца. Кожнаму цыклу прысвойваецца назва жывёлы.

З 11 лютага 1995 года пойдзе апошні год 12-гадовага цыкла. Год сіняга сабакі зменіць год сіняй свінні. Колер года абазначае элемент прыроды. Сіні -- гэта дрэва. Што ж можа прынесці нам год Свінні?

## 1995 г. -- ГОД СВІННІ

Астролаг прадсказвае перамены да лепшага і нават дастатак. Спрыяльны час для банкіраў і інтэлігенцыі. Для тых, хто нарадзіўся ў год Пацука, -- толькі добрыя весткі, Быку -- шмат работы, Тыгру -- рызыкуй і ўсё атрымаеш, Кот будзе спакойны і набудзе сяброў, Дракон -- заўсёды спрытны і заўсёды пры грашах, а вось Змяі нічога добрага -- цярпліва чакайце лепшага, Каню -- куча грошай, Каза здолее пабудаваць асабісты дабрабыт на шчасці іншых, але асцярожнасць будзе зусім не лішняй, Малпе -- фартуна скончылася, спраў вельмі шмат, Пеўню грошы будуць давацца з цяжкасцю, Сабака нарэшце задумаецца аб дастатку і сям"і. Свіння будзе шчаслівая ў каханні, не пакіне яе вязенне і ў справах.

## КІНАСЮРПРЫЗЫ -- 94

Адыходзячы 1994 год сёння можна без перабольшвання назваць годам прарыву элітарнага кіно на тэлебачанне СНД. Сапраўдныя знатакі гэтага цудоўнага віду мастацтва мелі мноства сустрэч з фільмамі рэжысёраў, імёны якіх ужо даўно сталі легендай: І.Бергман, Л.Бунюэль, Р.Вадзім, Л.Вертмюллер, К.Понці, Э.Скола, браты Тавіані, Р.В.Фасбіндэр, Ф.Феліні, Э.Фольі, Б.Фос і інш. Студэнцкі часопіс "Скальд" правёў апытанне сярод студэнтаў, выкладчыкаў



філфака і склаў дзесятку найбольш цікавых фільмаў, якія дэманстраваліся ў гэтым годзе па тэлебачанні:

1. "Кабарэ".
2. "Дазвольце прадставіцца, Рока Папалеа".
3. "Шчаслівыя".
4. "Доўгага жыцця, сеньёры".
5. "У светлую месячную ноч".
6. "Гэты цьмяны прадмет жадання".
7. "Я хачу толькі, каб вы мяне кахалі".
8. "Шокавая тэрапія".
9. "Халодныя закускі".
10. "Ноч святога Лаўрэнцыя".

Застаецца спадзявацца, што падобныя кінасюрпрызы будуць чакаць нас і ў 1995 годзе, калі сусветная культурная грамадскасць адзначыць 100 год з дня з"яўлення першага кінафільма.

**В.БОРТНІК,**
рэдактар студэнцкага часопіса"Скальд",
студэнт 4-га курса філалагічнага факультэта.

СПОРТ

## ДЗЕНЬ БЕГУНА

Ён уваходзіў у праграму спартакіяды студэнтаў універсітэта, якія змагаліся за ўзнагароды ў лёгкаатлетычным комплексе "Дынама". На старт выйшлі 273 спартсмены з усіх факультэтаў. У камандным заліку ўпэўненую перамогу атрымалі студэнты факультэта фізічнай культуры і спорту. Яны набралі 5160 ачкоў. Значна адсталі ад іх другія прызёры -- будучыя фізікі. На іх рахунку 2740 ачкоў. Усяго 25 ачкоў уступілі ім студэнты гісторыка-юрыдычнага факультэта. На наступных месцах адпаведна лёгкаатлеты філалагічнага, матэматычнага, геолага-геаграфічнага, эканамічнага і біялагічнага факультэтаў.

У асабістым заліку па-за канкурэнцыяй аказаліся выхаванцы факультэта фізічнай культуры і спорту.

На дыстанцыі 500 м перамагла Таццяна Аляксухіна -- 1.24,6. Усяго толькі на 1,6 сек. адстала ад яе Ірына Макут. Яшчэ менш адрыў ад другога прызёра ў Вольгі Гошка -- 1.26,3.

Больш пераканаўчай была перамога Леаніда Берасnёва на кіламетровай дыстанцыі. Ён пераадолеў яе за 2 мін.40,9 сек.

Вынік другога прызёра Алега Навуменкі -- 2.45,7, трэцяга Аляксея Кашаедава -- 2.47,3. Каманды-прызёры спаборніцтваў узнагароджаны граматамі, а пераможцы і прызёры ў асабістым заліку -- граматамі спартклуба і грашовымі прэміямі.

**Ю.ПРАЦКО,**
галоўны суддзя спаборніцтваў, суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- палітычнай сацыялогіі -- дацэнта;
-- фізічнай метралогіі -- дацэнта;
-- батанікі і фізіялогіі раслін -- дацэнта;
-- фізвыхавання -- дацэнта;
-- бухгалтарскага ўліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці -- дацэнта /2/, асістэнта;
-- заалогіі і аховы прыроды -- асістэнта;
-- псіхалогіі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, прафком, калектыў кафедры педагогікі выказваюць спачуванне асістэнту **КОЦУР** Алене Міхайлаўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты: -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар
Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ

Падпісана да друку 26.12.94.